Курс валют: $ 3.22 | € 3.6 | ₽100 3.41 | Погода в Воложине: 11 °C

Версия для слабовидящих

Поиск

Язык

BE RU EN

В свежем выпуске

Мы ценим вашу конфиденциальность

Для обеспечения удобства пользователей сайта мы используем Политику конфиденциальности персональных данных ПОДРОБНЕЕ

Отклонить всё

Принять всё



07.07.2024

318 просмотров

Ліпеньскае

Калонка паэта, празаіка, намесніка дырэктара выдавецтва «Мастацкая літаратура» – галоўнага рэдактара часопіса «Полымя», лаўрэата спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне «Мастацкая літаратура», лаўрэата Нацыянальнай літаратурнай прэміі, нашага земляка Віктара Шніпа. Незабыўнае

07.07.2009. Сёння Купалле. Цвіце ліпа. Тэлефануе Ліпскі і пытаецца пра кнігу, прысвечаную Купалу, якую ён падрыхтаваў для нашага выдавецтва. Кажу як ёсць: “Кніга на афармленні ў мастакоў. Цяпер яе выхад залежыць толькі ад іх”. Ліпскі дзя
ка
по
ма

02.
Ка
жа
“П
варон, пра якіх так весела мне расказалі, што і

Мы ценим вашу конфиденциальность

Для обеспечения удобства пользователей сайта мы используем Политику конфиденциальности персональных данных ПОДРОБНЕЕ



Смотреть PDF

БЕЛТА

03.10.2024 16:23

В Брестской области начали включать отопление в объектах соцсферы

На жаль, увесь час ішоў дробны дождж. Гусей ж гуляць пад парасонамі па парку было хораша. Зазірнулі мы і на “Птушыны востраў”, дзе амаль адразу напаткалі двух варон, якія, пакуль мы хадзілі, увесь час былі непадалёк, нібыта віжавалі за намі. І калі мы ўжо збіраліся дамоў, як пачуўся параходны гудок і, нібыта вынырнуўшы з XIX стагоддзя, міма вострава ў дажджлівай прасторы праплыў белы цеплаход…



05.07.2011. Сёння ў маёй Людмілы Дзень нараджэння. Каб нешта талковае купіць і падарыць ёй, няма дастаткова грошай. Хацеў верш напісаць, але не напісаў. Знайшоў ранейшы, які канкрэтна прысвечаны Людміле:
Ты ў мяне адна, нібыта неба раннем,
Светлае, нібы царкоўнае віно,
У якім надзея, вера і каханне
Злітыя, нібыта ў сонца, у адно
Светлае, святое і, як кроў, зямное,
Без якога не пачнецца вечны шлях…
Дзень прайшоў і сум,
нібы згарэла Троя.
Я з табой, як попел на тваіх нагах.



10.07.2011. У Ракаве на доме Вячаслава Рагойшы, дзякуючы раённым уладам, скульптару Івану Міско і самому Вячаславу Пятровічу, была ад
до
бел
Па
ска
“І н
хо
па
Валянціна Іосіфаўна, у якой, працуючы ў Пуганейскай школе, жыў будучы доктар

Мы ценим вашу конфиденциальность

Для обеспечения удобства пользователей сайта мы используем Политику конфиденциальности персональных данных ПОДРОБНЕЕ


раённай газеты Адам Мальдзіс. Дзякуючы Мальдзісу, Караткевіч і быў у Пугачах…

23.07.2011. Раніцай хмары каля сонца, як вата, прыкладзеная анёламі да Божай раны…
У мамы пад падушкай каляндар “Родны край”, з якога яна час ад часу адрывае лісты. Сёння ў мамы яшчэ 18 ліпеня…

30.07.2012. Учора ўдзельнічаў у свяце паэзіі “Ракуцёўскае лета-2012”, прысвечанае Максіму Багдановічу. Нягледзячы на спёку, народу ў Ракуцёўшчыне сабралася чалавек дзвесце. Было шмат моладзі і дзяцей. Вярнуўся дамоў загарэлы, як камбайнер…
“З яе вецер скульптуру рабіў!” – сказаў мастак Эдуард Агуновіч пра Алесю Сівохіну, якая ў лёгкай, але непразрыстай сукенцы на свяце “Ракуцёўскае лета-2012” больш за тры гадзіны правяла на сцэне, даючы слова выступоўцам…

03.07.2013. З Максімам ездзілі ў Пугачы. Я грады палоў, а сын касіў у садзе. У тры гадзіны з Палачанкі патэлефанаваў Лёня Шчарбінскі з прапановай прыехаць і забраць нас у Мінск. Мы адмовіліся, бо наш аўтобус з Пугачоў адпраўляецца ў сем вечара, а гэта яшчэ чатыры гад
Кр
ня
ра
Со
па
Вул
ха
Бацька са мной, як я з сынам, не хадзіу па палях каля вёскі. Бацьку проста не было калі…









Мы ценим вашу конфиденциальность

Для обеспечения удобства пользователей сайта мы используем Политику конфиденциальности персональных данных ПОДРОБНЕЕ

над сонцам абгортКі ад цукерак, якія у дзяцінстве я збіраў у драўляную скрыначку…

01.07.2014. Ізноў дождж, як восенню. У двары бязлюдна. Машыны пад дажджом стаяць, як сабакі, якіх выгналі з кватэр…

09.07.2014. З зялёнай руды, што на дрэвах, падаюць, выплаўленыя сонцам, залатыя кроплі восеньскай лістоты…

01.07.2015. Над дрэвамі бліснула маланка, загрымеў гром, і з кроны старой ліпы ўзляцелі вароны, як абвуглелая лістота…

03.07.2016. Пад грымотнымі нябёсамі дождж збівае з дрэў жоўтую лістоту так, нібыта злуецца, што тут без яго амаль восень наступіла…
Калі ты не ідзеш да вады, вада сама рана ці позна прыходзіць да цябе. З неба. І вада затапляе гарадскія вуліцы, як лабірынты Мінатаўра, у якіх тут жа спыняюцца машыны. І машыны стаяць разгубленыя, як іхнія гаспадары. І вада напаўняе перасохлыя забытыя рэчышчы, напамінаючы нам, што даўнія старыя шляхі да мора яшчэ існуюць. І вада размывае дарогі і сцяжыны, на якіх даўно няма тваіх слядоў, бо ты сядзіш каля камп'ютара, як каля акна ў прыдуманы свет. І дождж ідзе, як Валзяная Арда, захопліваючы ўсё пе
ва

28.
дв
ра
і ў
са
ў нас на лецішчы, як на курорце!" Міёну прывезлі
а палове дзясятай. Як толькі наша малая ўбачыла

ФЕДЕРАЦИЯ ПРОФСОЮЗОВ БЕЛАРУСИ









Мы ценим вашу конфиденциальность


Для обеспечения удобства пользователей сайта мы используем Политику конфиденциальности персональных данных ПОДРОБНЕЕ


паратунак. Людміла была дома. Міёна і яе ўсю абцалавала. Потым доўга хадзіла па кватэры. Радавалася сваім цацкам. Паляжала на ўсіх сваіх любімых месцах, не забываючы праз хвіліну падысці да нас і палашчыцца. Гадзіны паўтары нічога не ела, а толькі час ад часу прагна піла ваду і глядзела запытальна: “Я дома ці мне гэта ўсё сніцца?”

02.07.2017. Дождж. Неяк сумнавата. Пачынаю думаць пра вясёлае і светлае. Узгадваецца вандроўка ў Італію. Венецыя. Фларэнцыя. Піза. Рым. Ватыкан. Светла. Цёпла. У Венецыі з Людмілай і сябрамі сядзім на прыстані, звесіўшы ногі над вадой, у якой люструецца сляпучае сонца. У мяне абутак на нагах ледзьве трымаецца, і мне здаецца, што ён упадзе ў ваду і назаўсёды застанецца тут, у Венецыі. У вадзе блішчаць капейкі. У нас сваіх няма. Кідаем цэнты, каб зноў сюды прыехаць. Прыедзем! А пакуль што я ў думках паўтараю свае вандроўкі па Еўропе. У мінулым годзе былі ў Паланзе. Нібыта ўчора. Яшчэ ногі памятаюць Балтыйскую ваду і пясок. Сёлета нікуды не паехаў і не паеду. Гляджу Міёну. Цяпер яна ляжыць каля мяне і дрэмле. Ёй добра. Усе дома. Ці памятае яна Максіма? Ён хутка прыедзе ў адпачынак з войска. Чакаем. А до
які

04.
др
пр
др
пр
людзьмі. Ды і ў нашым жывём толькі мы –
Людміла, я і Міёна. І мы наогул на востраве, над







Мы ценим вашу конфиденциальность

Для обеспечения удобства пользователей сайта мы используем Политику конфиденциальности персональных данных ПОДРОБНЕЕ

крычалі і не махалі.

06.07.2017. Ліпы мядуюць. А пчол не чуваць і не бачна. Год таму ранкам і вечарам я ў шортах і кашулі з кароткімі рукавамі выгульваў Міёну. А цяпер і ў куртцы не заўсёды цёпла. І, ходзячы сярод ліп, думаю пра пчол, якім таксама холадна. І сонца, якое зрэдку праглядае з-за хмар, што плывуць з Балтыкі, я хачу параўнаць з напоўненай мёдам бочачкай. І не параўноўваю. Цяпер сонца падобнае на велізарны бурштын у халоднай вадзе сусвету…

07.07.2017. Вечар. У двары ціха. Святло ў вокнах, як спалоханае. Раз – і патухла ў адным. Раз – і патухла ў другім. Людзі кладуцца спаць. А ты не хочаш. Ты глядзіш на чужыя вокны, як на чужыя сусветы, дзе існуе разумнае жыццё…

09.07.2017. Вечар. Акно занавесіў. Уключыў святло. Адпачываю ад тлуму. Ластаўкі ў двары папіскваюць, нібыта напамінаюць, што яшчэ лета. А лета толкам яшчэ і не было. А восень ужо недзе за гарой. А ў нас у вёсцы Юстынава гара. І калі мама казала, што ўжо восень за гарой, я ішоў на Юстынаву гару і глядзеў на лес, што быў за гарой. Глядзеў доўга, пакуль не ўгледжваў над лесам коршака. І коршак быў для мяне восенню. Чаму ко
жа


13
На
ко
до
сц
сышоў з горада…



Выбор редакции

18.09.2024

МВД приглашает обсудить проект изменений в ПДД для электросамокатчиков и велосипедистов



Мы ценим вашу конфиденциальность

Для обеспечения удобства пользователей сайта мы используем Политику конфиденциальности персональных данных ПОДРОБНЕЕ

Гляджу на дрэва, і мне здаецца, што яно спрабуе паляцець з нашага двара, але ніяк не можа адарвацца ад зямлі, на якой ляжыць асфальт…

14.07.2017. З Міёнай на Мухлі спыніліся каля яблыні. Яблыкаў няма. У небе высока-высока ляціць самалёт. Я глядзеў на яго і думаў пра вёску, пра бацькоў. Узгадаў Лягезы, дзе да школы гадаваўся ў бабулі Ганны. Дзядзька Віця з цёткай Стасяй запрашалі прыязджаць. Можа і прыедзем з Людмілай і дзецьмі. Нядаўна, вяртаючыся з Пугачоў з сястрой Валяй і яе мужам і дачкой, праязджалі па гасцінцы каля Лягез. Вёскі цяпер не бачна з-за лесу. Калі я быў малым, я ў ляску пасвіў кароў. А так нярэдка прыходзіў да гасцінца, каб убачыць машыну, якая будзе праязджаць міма. Часам сядзеў паўдня, каб убачыць хоць адну, а часам, прасядзеўшы амаль дзень, не бачыў аніводнай. Гэта было больш за 50 гадоў таму. Даўно! Колькі за гэты час людзей памерла і колькі нарадзілася! Уга колькі! Пакуль я ўзгадваў дзяцінства, самалёт праляцеў. Да нас з Міёнай па сцяжыне прыблізілася старая з катом. Міёна хацела пабегчы да ката. Не пусціў. Старая ўзяла пушыстага гадаванца на рукі і хуценька прайшла каля нас.

18.07.2017. Прыйшоў з працы. Прылёг на хвілінку і

Мы ценим вашу конфиденциальность

Для обеспечения удобства пользователей сайта мы используем Политику конфиденциальности персональных данных ПОДРОБНЕЕ

пр
пр
дз
пр
вул
пач

20.
тэпаюць парамі пажылыя, маладзейшыя ў


знать потребителю?


Куда могут обратиться белорусы по вопросам ликвидации последствий урагана


«Работники банка» звонят с белорусских номеров и называют персональные данные: новая схема

Instagram







Ещё
Подписаться

на лаўках. Я праходжу міма азярыны. Я з сабакам. З вялікім. Усе баяцца. І я гляджу на жыццё вакол азярыны здалёку і чамусьці ўяўляю карціну Брэйгеля “Паляўнічыя на снезе”, на якой растаў снег…

29.07.2017. Гэтым летам яшчэ рыбы не лавіў. Грыбоў і ягад не збіраў. Вогнішча не паліў. У рацэ не купаўся. Кепска. Але ж дзясяткі разоў бачыў, як узыходзіць сонца над горадам і як заходзіць, як свецяць зоркі, як поўня робіцца маладзіком, а маладзік ператвараецца ў поўню. І яшчэ шмат чаго б не ўбачыў, калі б не выходзіў з дому а палове шостай раніцы і не гуляў позна вечарам па Мухлі. Някепска ўсё-такі лета праводжу, а тым больш яшчэ да восені ёсць час папаліць вогнішча. Люблю вогнішчы! Я іх у дзяцінстве нават на ганку роднай хаты распальваў. Бацькі ганялі, крычалі, страшылі, а я распальваў і глядзеў на агонь, як на сябра…

03.07.2018. Да выхадных прывыкаеш. І здаецца, што лепей за выхадныя нічога няма на свеце. І тое, што заўтра трэба ісці на працу – гэта няпраўда, якую ты сабе прыдумаў, каб адпачыць ад выхадных…

04.07.2018. Маладзік, як абрывак афішы на ве… …
Не…
рэ…

05.
Дз…
Іва…
ві…
га…
Паразмаўлялі крыху пра жыццё-быццё. Раіса

БЕЗОПАСНОСТЬ | ГЛАВНОЕ | КАЛЕЙДОСКОП | ОБЩЕСТВО | ОФИЦИАЛЬНО | ПРОИСШЕСТВИЯ | СЕЛЬСКОЕ ХОЗЯЙСТВО | ЭКОНОМИКА

Мы ценим вашу конфиденциальность

Для обеспечения удобства пользователей сайта мы используем Политику конфиденциальности персональных данных ПОДРОБНЕЕ

Людміле у падарунак на дзень нараджэння у
тралейбусе напісала экспромт:
Дыхаюць водарна ў ліпені словы.
Пчолы раяцца пад ліпай на ўзлеску.
І, нібы з промняў сатканы,
іх узятак мядовы
У дзень народзінаў Люды Рублеўскай.

07.07.2018. Дзякуючы запрашэнням арганізатараў рэспубліканскага свята паэзіі, песні і народных рамёстваў «З адною думкаю аб шчасці Беларусі...», прысвечанага 136-у дню нараджэння Янкі Купалы, пабываў у Вязынцы. Было сонечна і людна, а самае галоўнае – святочна. У купалаўцаў сцэнарый імпрэзы быў як лірычна-патрыятычная паэма.

Усім даспадобы прыйшоўся гурт «Арацэя» з традыцыйнымі купальскімі песнямі. Слухаючы музыкаў, я забыўся на тое, што недзе ёсць Мінск са сваім тлумам і шумам. Я быў у пачатку мінулага стагоддзя і сядзеў разам з Купалам у Вязынцы. І нам было добра. І сонца было над намі.
Час ад часу праз Вязынку праходзілі электрычкі і грузавыя цягнікі. І як бы яны ні грукацелі і ні свісцелі, на іх ніхто не звяртаў увагу. Уладарылі вершы і музыка.

09.
тра
яко
пту
па
па

Мы ценим вашу конфиденциальность

Для обеспечения удобства пользователей сайта мы используем Политику конфиденциальности персональных данных ПОДРОБНЕЕ

Хочу поговорить. Авторская колонка Екатерины Король

Предыдущая новость

Безопасность у воды: спасатели учат детей правилам купания

Следующая новость

valozhin.by
ИНФОРМАЦИОННЫЙ ПОРТАЛ ВОЛОЖИНСКОГО РАЙОНА



Редакция

222357, г. Воложин, ул. 1 Мая, д. 3

8-01772 55392

valozhyn-media@yandex.by

SAKURAWEB STUDIO
web-разработка · интернет-маркетинг
Разработка макета и техподдержка

Мы ценим вашу конфиденциальность

Для обеспечения удобства пользователей сайта мы используем Политику конфиденциальности персональных данных ПОДРОБНЕЕ